# ВАЖНЫ ВЫБАР ДЛЯ КОЖНАГА

***Каля 650 вучняў з Віцебска і вобласці наведалі Дзень адчыненых дзвярэй у ВДУ напрыканцы кастрычніка.***







Каб вучні маглі падрабязней даведацца пра факультэты ўніверсітэта, у файе працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі, а ў актавай зале прайшоў канцэрт. З прывітальным словам да прысутных звярнулася Мірослава Бобрык, прарэктар па вучэбнай рабоце, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт. Яна адзначыла, што быць студэнтам нашага ўніверсітэта – ганарова, бо ВДУ – галоўны цэнтр рэгіянальнай адукацыі, навукі і культуры.

Я ж запыталася ў хлопцаў і дзяўчат, на які факультэт яны збіраюцца паступаць і чаму.

**Анастасія БУЛАЙ, сярэдняя школа № 1 г. Новалукомля імя Ф.Ф. Дуброўскага:**

– Я планую паступаць на факультэт сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі. У будучым хачу стаць кваліфікаваным псіхолагам і дапамагаць дзецям і падлеткам разбірацца з праблемамі. Спадзяюся, ужо ў наступным годзе стану студэнткай ВДУ і пачну рабіць першыя крокі для рэалізацыі сябе ў прафесійнай дзейнасці.

**Карына АЛЯКСАНДРАВА, сярэдняя школа № 3 г. Віцебска імя Л.М. Бяліцкага:**

– Я хачу навучацца па спецыяльнасці «Біяэкалогія» на факультэце хіміка-біялагічных і геаграфічных навук. Любоў да біялогіі мне прывіла мая настаўніца А.М. Новікава. Як і яна, я хачу працаваць у школе. А пакуль наведваю курсы на падрыхтоўчым аддзяленні ВДУ. Мне падабаецца, бо наш выкладчык А.М. Дудараў лёгка і зразумела тлумачыць нават самы складаны матэрыял.

**Вадзім ШНІТКОЎ, сярэдняя школа № 4 г. Наваполацка:**

– Я ўпершыню прыехаў у ВДУ, але ўжо з першых хвілін зразумеў, што ва ўніверсітэце пануе цёплая і душэўная атмасфера, а працуюць у гэтай вышэйшай навучальнай установе прыемныя людзі. Я хачу стаць студэнтам факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій. Для сябе я ўжо вырашыў, што хачу звязаць жыццё са сферай IT-тэхналогій. Думаю, што гэта не толькі цікава, але і прэстыжна.

**Аліна УСОВІК, сярэдняя школа № 11 г. Наваполацка:**

– Мая мара – стаць студэнткай мастацка-графічнага факультэта. Мне падабаецца займацца творчасцю і ствараць нешта новае і цікавае. Я навучаюся ў педагагічным класе, у будучым хачу працаваць настаўнікам. Я ўпэўнена, што стану самым лепшым педагогам.

**Дзіяна НІКІЦІНА, Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава:**

– Я не аднойчы чула, што ВДУ – адзін з самых лепшых універсітэтаў. У будучым я хачу працаваць з дзецьмі, бо лічу, што прафесія настаўніка – самая лепшая. Збіраюся паступаць на завочную форму навучання на педагагічны факультэт, каб атрымаць вышэйшую адукацыю і многаму навучыцца ў прафесіяналаў.

**Аляксандр НАЗАРАЎ, сярэдняя школа № 19 г. Віцебска:**

– Я заўсёды марыў працаваць у праваахоўных органах, таму планую паступаць на юрыдычны факультэт. Лічу, што ведаць правы, абавязкі і законы важна і неабходна. Да таго ж штодзённа праглядаю старонкі ВДУ ў сацыяльных сетках і бачу, што жыццё тут цікавае і насычанае.

**Марыя ШЭЙНА, сярэдняя школа № 3 г. Віцебска імя Л.М. Бяліцкага:**

– Хачу навучацца ў Ліцэі ВДУ на гуманітарным профілі, бо мне заўсёды падабаліся мовы і гісторыя. Думаю, што, дзякуючы Ліцэю, я змагу больш дакладана вызначыцца з выбарам будучай прафесіі, а вучыцца мне будзе цікава.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**

**Фотаздымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота- і відэарэпартаж глядзіце з дапамогай QR-кода.